ЗДАРЭННЕ

У Гродне міліцыя заблакавала грамадскіх актывістаў. Адзін з іх у кардыялогіі

3 ЛІПЕНЯ 2018, 11:36



Сябры Аб'яднанай грамадзянскай партыі хацелі правесці на Дні незалежнасці акцыю-перформанс, які нагадвае пра цяжкія сацыяльныя ўмовы ў краіне і парушэнні правоў чалавека. Пра іх акцыю даведаліся праваахоўнікі, і заблакавалі іх раніцай 3-га ліпеня у кватэры.

— Нас спрабавалі затрымаць (людзі ў штацкім — заўв. рэд.), але мы збеглі і цяпер нас пільнуюць пад іншай кватэрай ужо. Мы хацелі правесці ў Гародні акцыю — адсвяткаваць Дзень незалежнасці. Я б сказаў, што гэта ўвогуле больш сацыяльная акцыя пра ўзровень жыцця ў Рэспубліцы Беларусь. Больш такая максарадная акцыя з намёкамі на «добрае жыццё» ў нашай краіне. Стаяць пад падездам не выпускаюць нікуды. Вы не паверыце, цяпер маскіруемся, — кажа Аляксандр Лаўрэнцьеў





Актывісты планавалі выйсці на афіцыйнае святкаванне ў турэмным адзенні з плакатам, на якім намаляваны дрот і змешчаны надпіс «Беларусь — краіна для жыцця».



Па інфармацыі з сацсетак, актывістаў завезлі ў Кастрычніцкі РАУС. З яго Мікалаю Саляніку давялося з'ехаць на «хуткай» у кардыялогію. У РАУСе журналісту hrodna.life адмовілі ў каментарах, бо, па іх меркаванню, hrodna.life — гэта не прэса.

Як расказаў Сяргей Верамеенка з БХД, Аляксандра Лаўрэнцьева і Мікалая Саляніка затрымалі па адміністрацыйнай справе — ДТЗ. У РАУСе у Мікалая адбыўся гіпертанічны крыз, і ў суправоджванні супроўніцы РАУСа яго павезлі ў бальніцу. Аляксандр знаходзіцца ў ізалятары. Інфармацыі пра яго не даюць. Магчыма, бліжэйшым часам яго будуць судзіць.

Затрымлівалі актывістаў невядомыя асобы. Таму Яўген Дудкін напісаў заяву аб выкраданні людзей.

Іншым актывістам расказалі, што Саляніка і Лаўрэнцьева затрымалі за адміністратыўнае правапарушэнне супрацоўнік АМАПа. У РАУСе кажуць, што актывісты ўчынілі непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі. Сведкі кажуць, што супрацоўнікі АМАПу былі ў штацкім, не прадставіліся, пры сабе ў іх былі пісталеты і аўтаматы АКС-74.

Тым часам гродзенская міліцыя піша, што забяспечвае правапарадак падчас свята.

УВД Гродненского облисполкома
33 минуты назад

Милиция обеспечивает правопорядок на День Независимости

В Гродненской области и городе Гродно проходят праздничные мероприятия, приуроченные ко Дню Независимости Республики Беларусь. Стало уже традиционным, что погода в этот день особо не радует. Несмотря на это в местах массового отдыха граждан и на митинге многолюдно. Молодежь и старшие поколения едины в духе любви к нашей Родине, которая проявляется в такие дни по-особому. Переполняют чувства гордости и патриотизма, осознание того, чтоб мы живем в суверенном государстве с мирным небом над головой, которое обеспечили нам ветераны войны...

Продолжаются праздничные мероприятия. Сотрудники органов внутренних дел обеспечивают правопорядок и готовы оказать гражданам необходимую помощь.

Игорь Белозеров

0

РАІМ ПАЧЫТАЦЬ

У Шчучыне на працоўным месцы памёр міліцэйскі начальнік. Што пра гэта вядома?

У гімназіі № 5 падчас урокаў памерла 12-гадовая дзяўчына

Польская пракуратура расследуе смерць беларуса ў варшаўскім ізалятары

АПОШНІЯ ЗАПІСЫ

У доме палітыка Аляксандра Мілінкевіча прайшоў ператрус

18 СНЕЖНЯ 2023, 10:46

Падарункі на Каляды прыносяць не толькі мужчыны-чараўнікі: альтэрнатывы Дзеду Марозу з розных краін

17 СНЕЖНЯ 2023, 17:56

Стары замак не справіўся з экскурсіямі: вінаваты новы Кодэкс аб культуры

15 СНЕЖНЯ 2023, 19:30

Дзіцячая пляцоўка і кавярня. На «Прывалцы» пабудуюць зону чакання з электроннай чаргой

15 СНЕЖНЯ 2023, 16:32



FACEBOOK / INSTAGRAM / TELEGRAM / RSS / YOUTUBE / ВКОНТАКТЕ

2016-2023 Выкарыстанне матэрыялаў сайта дазваляецца паводле правілаў ліцэнзіі Creative Commons BY-SA 4.0 Int са спасылкай на крыніцу і ўказаннем аўтара. Падрабязныя правілы перадруку тут .